**У.М.Макараў,**
*суіскальнік кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

# КУЛЬТУРНА-ТВОРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ ЯК УМОВА ПРАФІЛАКТЫКІ АДХІЛЕННЯЎ У ПАВОДЗІНАХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

Адхіленні ў паводзінах ваеннаслужачых з'яўляюцца небяспечным дэстабілізуючым фактарам, які негатыўна ўздзейнічае не толькі на Узброеныя Сілы, але і на дзяржаву наогул, бо становішча спраў у войску з'яўляецца адным з індыкатараў, па якім вызначаецца становішча сацыяльнай бяспекі.

Ваеннаслужачыя тэрміновай службы ў цяперашні час складаюць менш за 40 % агульнай колькасці Узброеных Сіл, але менавіта ў гэтай катэгорыі асабовага саставу больш за 70 % правапарушэнняў.

Нягледзячы на гэта, адчуваецца востры дэфіцыт даследаванняў крыміналагічных, сацыяльна-псіхалагічных і асабліва сацыяльна-культурных аспектаў прафілактыкі адхіленняў у паводзінах ваеннаслужачых.

У 1995—1998 гг. намі было праведзена спецыяльнае даследаванне сацыяльна-культурных праблем прафілактыкі адхіленняў у паводзінах ваеннаслужачых тэрміновай службы. Выяўлена, што маецца ўзаемазалежнасць паміж узроўнем духоўнай культуры, арыентацыяй на пэўныя віды дзейнасці ў вольны час і ўзорамі сацыяльна-негатыўных паводзін, што нізкі ўзровень культуры з'яўляецца фактарам фарміравання негатыўных паводзін.

У працэсе даследавання намі былі вывучаны каштоўнасныя арыентацыі моладзі (1). Выяўлена, што нізкія рангавыя месцы займаюць такія каштоўнасці, як гуманнасць, цікавасць да мастацтва, а таксама адукацыя. Моладзь, што праходзіць сёння тэрміновую службу, мае невысокі агульнаадукацыйны і культурны ўзровень.

Дамінуючая арыентацыя на аўдыёвізуальныя крыніцы атрымання культурнай інфармацыі (62 %) прыводзіць да таго, што 49 % маладых людзей ніколі не наведвалі тэатры, 37 % — выставы і музеі, 17 % — эстрадныя канцэрты, 12 % — не чыталі кніг.

Характэрныя адказы на пытанне: "Які рэпертуар кінатэатраў і тэлеканалаў найбольш пераважны для Вас?" Першае месца займаюць адказы — "баявік" (78 %), другое — "лёгкая камедыя" (73 %), трэцяе месца — "містычныя фільмы і фільмы жахаў" (62 %). Толькі дзевятае месца займаюць фільмы з ваенна-патрыятычнай тэматыкай (23 %), дзесятае — фільмы аб сучасных праблемах (22 %), адзінаццатае месца — фільмы аб гістарычных асобах (21 %).

Рэгулярна чытаюць творы літаратуры толькі 21 % ваеннаслужачых, наведваюць эстрадныя канцэрты 10 %, кінатэатры — 9 %, выставы і музеі — 2 %.

Гэта важна і ў сувязі з тым, што шматлікія даследаванні замежных спецыялістаў, якія вывучалі ўздзеянне мастацтва праз сродкі мас-медыя, прысвечаны больш за ўсё "шкодным уплывам". У цэнтры ўвагі было насілле. Найбольш вывучаным аказаўся тэзіс аб тым, што "крымінальныя фільмы параджаюць крымінальнасць" (4).

Як справядліва зазначае А.А.Сукала, для маладых людзей, у якіх анамальна фарміруецца асоба ў выніку ўздзеяння разнастайных неспрыяльных фактараў, субкультура злачыннага свету, каштоўнасці гэтага свету выступаюць як станоўчыя. Іх "выхаваўчая" роля заключаецца ў тым, што яны пераводзяць у кантэкст значнасцей асобы антыграмадскія нормы, ідэалы і каштоўнасці (3).

"Калі людзей з дэфіцытам культуры аб'яднаць, сканцэнтраваць у зачыненых суграмадствах і воляй ці няволяй даць ім некаторыя магчымасці самаарганізацыі, то ў такіх суграмадствах сацыяльнае быццё поўнасцю адпавядае прыродзе чалавека, не выхаванага ў сучаснай культуры, прыродзе дзікуна" (2).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падобныя рысы “першабытнага прымітывізму” можна знайсці ў асяроддзі злачыннага свету і, як ні сумна, у суграмадствах шматлікіх вайсковых падраздзяленняў.

Разам з тым найбольш важным вынікам нашага даследавання з’яўляецца тое, што армія, нягледзячы на мноства ўласцівых ёй недахопаў, застаецца тым інстытутам дзяржавы, дзе, дзякуючы сваёй арганізацыі, у поўнай меры можна рэальна садзейнічаць прэвентыўнай практыцы — актыўнаму перавыхаванню ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія маюць негатыўныя якасці.

Умелая арганізацыя вольнага часу ваеннаслужачых, павышэнне псіхолага-педагагічнай культуры афіцэраў і ўдасканаленне духоўна-маральнага выхавання ў спалучэнні са спецыфічным укладам вайсковага жыцця — усё гэта можа стаць найважнейшым інструментам прафілактыкі негатыўных паводзін.

У працэсе даследавання намі была распрацавана і апрабавана праграма прафілактыкі негатыўных паводзін ваеннаслужачых сродкамі культурна-адпачынкавай дзейнасці. Праграма дапускае такую арганізацыю працы, пры якой забяспечаны цэласнасць і ўзаемаабумоўленасць усіх частак прафілактыкі сацыяльных адхіленняў: педагагічная дыягностыка, планаванне выхаваўчага працэсу, арганізацыя педагагічнага ўздзеяння і ацэнка вынікаў прэвентыўнай практыкі.

Пры гэтым найбольш важнымі элементамі арганізацыйнага і педагагічнага ўздзеяння з’яўляюцца:

— агульныя мерапрыемствы павышэння культуры ваеннаслужачых (правядзенне заняткаў па курсе “Культура і мастацтва” ў вольны час, правядзенне цыкла кінавечароў, арганізацыя працы лекторыя прававых і педагагічных ведаў, наведванне тэатраў, музеяў, памятных мясцін Беларусі);

— цыкл мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне вайсковага калектыву, умацаванне сяброўства і вайсковага таварыства;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— комплекс мерапрыемстваў індывідуальна-педагагічнага ўздзеяння, далучэнне ваеннаслужачых да культурна-творчай дзейнасці.

Прычыны негатыўных паводзін ваеннаслужачых абумоўлены, па-першае, грамадствам, па-другое, станам спраў у войску.

Гэтыя прычыны дыялектычна ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

Да апошняга часу пры аналізе прычын сацыяльных адхіленняў і арганізацыі сацыяльнай прэвентацыі ў войску абсалютызаваліся прычыны, абумоўленыя грамадствам. Такі падыход засланяў вывучэнне прычын негатыўных паводзін, абумоўленых нізкім узроўнем культуры моладзі.

Пры гэтым зусім не разглядаліся прычыны сацыяльных адхіленняў, якія маюцца ў самім войску. Дапускаліся спекулятыўныя разважанні на тэму адзінай бяды грамадства і войска, у значнай часткі службовых асоб сфарміравалася ўстойлівае меркаванне, што прафілактыка негатыўных паводзін ваеннаслужачых знаходзіцца па-за іх кампетэнцыяй.

Даследаванне паказвае, што найбольш важнымі прычынамі такіх паводзін з'яўляюцца:

1) неадпаведнасць сістэмы ўладна-арганізацыйных механізмаў нарматыўных паводзін ваеннаслужачых складанасці задач сучаснага этапу будаўніцтва Узброеных Сіл;

2) нізкая псіхолага-педагагічная і прававая культура часткі службовых асоб не дазваляюць арганізаваць прафілактычную дзейнасць у падпарадкаваных воінскіх часцях, што зніжае эфектыўнасць прымаемых мер па ўмацаванні дысцыпліны;

3) вельмі нізкі статус органаў выхаваўчай работы.

Даследаванні паказваюць, што, нягледзячы на абумоўленасць негатыўных паводзін шматлікімі прычынамі, усё ж ёсць магчымасць ажыццяўляць прафілактыку сацыяльных адхіленняў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацаваная і апрабаваная комплексная праграма прафілактыкі негатыўных паводзін ваеннаслужачых сродкамі культурна-адпачынкавай дзейнасці заснавана на палажэнні, у адпаведнасці з якім у сучасных умовах найбольш эфектыўны інтэграцыйны сацыяльна-педагагічны падыход да прафілактычнай працы ў войску, калі арыентацыя і прыярытэтнасць культурнага развіцця асобы ваеннаслужачага і стварэнне ўмоў для яго самаразвіцця накладваюцца на спецыфічны ўклад жыцця і дзейнасці ў арміі, што садзейнічае нейтралізацыі дзеяння дэлінквентна-субкультурных фактараў.

Далейшая распрацоўка праблемы папярэджання і пераадолення негатыўных паводзін у ваеннаслужачых дапаможа спецыяльнаму вывучэнню праблем новай галіны педагагічных ведаў — прэвентыўнай педагогікі і псіхалогіі ў адносінах да ўмоў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Даследаванне дало магчымасць распрацаваць спецкурс "Ваенная дэвіянталогія" для афіцэрскага саставу Узброеных Сіл. Спецкурс рэкамендаваны для ўключэння ў праграмы працы лекторыяў Дамоў афіцэраў, а таксама ў праграмы ваенна-навучальных устаноў.

У цяперашні час мы канстатуем, што ў войсках значна растуць цікавасць да дадзенай праблемы і разуменне неабходнасці прафесійнага падыходу да арганізацыі сацыяльнай прэвенцыі.

1. *Макараў У.М.* Некаторыя праблемы каштоўнасных арыентацый ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь // Сацыяльна-педагагічная работа. — 1998. — № 2. — С. 33—43.

2. *Самойлов А.А.* Перевернутый мир. — СПб., 1993. — 224 с.

3. *Сукало А.А.* Педагогические основы профилактики правонарушений в сфере подростково-молодежного свободного времени. — СПб., 1996. — 219 с.

4. *Bisky L., Wideman D.* Der Spielfilm und Wirkund. — Berlin, 1985. — S. 94.